Пролетарыі ўсіх краін, аднаўцеся!

ЗАРА

орган Брэсцкага абкома КП(б)Б і аблвыканкома

№ 158 (230) | Нядзеля, 14 ліпеня 1940 г. | Цана 10 кап.

РЭСТАЎРАЦЫЯ АЎТАТРАКТАРНЫХ СВЕЧ У МТМ

У сямі машына-трактарных майстэрнях рэспублікі арганізуецца рамонт і рэстаўрацыя аўтатрактарных свеч. Рамонт і рэстаўрацыя іх будзе праводзіцца ў Магілёўскай, Слуцкай, Гомельскай, Віцебскай, Оршанскай і Даманаўскай МТМ Наркамзема, а таксама ў Мінскай МТМ Наркамсоўгасаў.

Рэспубліканская кантора Галоўаўтатрактарабыта арганізуе збор карпусоў, запальных свеч і забяспечвае аўтатрактарныя гаспадаркі новымі запальнымі свечамі ў абмен на старыя. (БЕЛТА).

Ваенна-марская медыцынская акадэмія

Совет Народных Камісараў СССР выпес пастанову аб арганізацыі ваенна-марской медыцынскай акадэміі. Акадэмія ствараецца на базе Трэцяга Ленінградскага медыцынскага інстытута, а таксама інстытута санітарна-хімічнай абароны. Яна будзе рыхтаваць урачоў для растучага магутнага ваенна-марскога флота Совецкага Саюза. (ТАСС).

УКАЗ

ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

Аб адказнасці за выпуск нядобраякаснай альбо некамплектнай прадукцыі і за незахаванне абавязковых стандартаў прамысловымі прадпрыемствамі.

1. Устанавіць, што выпуск нядобраякаснай ці некамплектнай прамысловай прадукцыі і выпуск прадукцыі з нарушэннем абавязковых стандартаў з'яўляецца супроцьдзяржаўным злачынствам, роўназначным шкодніцтву.

2. За выпуск нядобраякаснай ці некамплектнай прадукцыі і за выпуск з нарушэннем абавязковых стандартаў — дырэктараў, галоўных інжынераў і начальнікаў аддзелаў тэхнічнага кантролю прамысловых прадпрыемстваў аддаваць суду і па прыгавору суда падвяргаць турэмнаму зняволенню тэрмінам ад 5 да 8 год.

3. Даручыць пракурору СССР забяспечыць няўхільнае выкананне ўвядзення ў жыццё гэтага ўказа.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль. 10 ліпеня 1940 г.

План торфаздабычы павінен быць выканан

На XVIII з'езде ВКП(б) старшыня Совета Народных Камісараў Саюза ССР таварыш Молатаў сказаў: „Трэба ва ўсіх эканамічных раёнах прыняць меры да забеспячэння вытворчасці паліва на месцы, да поўнага вызвалення транспарта ад прывозу вугалю з далёкіх раёнаў".

Торф—самы танны від паліва. Залежы торфу багаты раёны нашай вобласці. Гэтая акалічнасць справы дазваляе кожнаму нашаму прадпрыемству і кожнай установе ў самы кароткі тэрмін арганізаваць здабычу торфу ў размерах, поўнасцю пакрываючых іх патрэбы ў паліве.

Перад пачаткам сезона торфаздабычы (у сакавіку) абласны выканаўчы камітэт распрацаваў план здабычы ў вобласці 90 тысяч тон торфу і на гэтую колькасць спусціў планы торфазаводам і раённым выканаўчым камітэтам.

Як-жа выконваюцца гэтыя планы?

Паступаючыя ў абласны цэнтр зводкі аб ходзе торфаздабычы на заводах і ў раёнах гавораць аб трывожным становішчы справы на гэтым участку гаспадаркі. Чатырма торфазаводамі: „Залессе", „Богач" „Тэльмы" і „Чэрнаўчыцы" на 10 ліпеня здабыта ўсяго 8.070 тон, або 18 процантаў іх плана. З 16 раёнаў, атрымаўшых план торфаздабычы, толькі 7 прыступілі да іх выканання. У Пружанах здабыта 1000 тон, пры плане 5000, у Ружанах — 927 тон, пры плане 3000, Кляшчэлях — 750 тон, пры плане 3000 і г. д.

У газеце „Зара" ад 12 ліпеня ўскрыты прычыны дрэннай здабычы торфу на буйнейшым у вобласці торфазаводзе „Залессе". Тут з пачатку сезона здабыта ўсяго 868 тон торфу, супроць планавага задання 8000 тон. У „Залессі" не выкарыстоўваюцца 4 торфаздабываючыя элеватарныя машыны, не праяўляецца патрэбных клопатаў аб рабочых, дапушчана цякучасць рабочай сілы.

Пара зразумець кіраўніцтву Кобрынскага раёна, што яно разам з дырэктарам торфазавода „Залессе" нясе адказнасць перад партыяй за выкананне плана здабычы мясцовага паліва. Кобрынскае кіраўніцтва павінна зрабіць усё неабходнае для таго, каб пусціць у ход усе машыны, забяспечыць завод рабочай сілай і замацаваць гэтую сілу да поўнага выканання плана торфаздабычы.

Адстаючым прадпрыемствам па торфаздабычы не перашкодзіла-б павучыцца ў перадавікоў — крухмальнага завода „Вялікія Сіхновічы", Жабінкаўскага раёна, (дырэктар таварыш Ганчароў) і спіртзавода „Ацечызна" гэтага-ж раёна (дырэктар завода таварыш Шыло).

Сіламі сваіх рабочых і сезоннікаў заводскі калектыў „Вялікія Сіхновічы" за 25 дзён загатовіў 750 тон торфу, замест 600 тон па плану і далей працягвае здабычу, сушку і штаблёўку яго. Дзесятнік таварыш Таланчук Дзмітрый арганізаваў шырокае сацыялістычнае спаборніцтва сярод рабочых і дабіўся выдатных рэзультатаў. У яго працуе сям'я таварыша Церашчук Міхаіла ў складзе трох чалавек; бацькі, дачкі — Хрысціны і сына Парфена, якая штодзённа здабывае 9 тысяч цаглін торфу замест 4,5 тысяч і зарабляе па 45 рублёў у дзень. Рэзчык торфу Ліпскі Аляксей штодзённа нарэзвае па 11 тысяч цаглін торфу і перавыконвае сваю норму ў 7 раз. Дзесяткі стахановаўцаў выявіліся ў брыгадах па здабычы торфу на тарфяным масіве „Ацечызна".

Поспех завода „Вялікія Сіхновічы" па забеспячэнню сябе тарфяным палівам састаіць і ў тым, што дырэктар завода таварыш Ганчароў і дзесятнік таварыш Таланчук Дзімітрый штодзённа клапаціліся аб людзях. Яны арганізавалі сыстематычную дастаўку промтавараў з заводскага ларка на месца работы тарфянікаў. Людзі бачылі і адчувалі клопаты адміністрацыі і ў адказ на гэта стараліся работаць больш і лепш.

Спіртзавод „Ацечызна" таксама загатовіў ужо 2 тысячы тон торфу і працягвае загатоўку да поўнага выканання паўторнага плана ў 2 тысячы тон. Работа на балоце праводзіцца дружна. Не дапускаецца разрыва паміж рэзкай, сушкай і штаблёўкай торфу. Тут усё што здабыта і высушана ўжо ўкладзена ў штабелі. За работай уважліва сочыць дзесятнік завода таварыш Шыдлоўскі Казімір.

Паліўны аддзел абласнога выканаўчага камітэта і яго загадчык таварыш Амбразевіч дрэнна займаюцца пытаннем здабычы мясцовага паліва, не кантралююць работы торфазаводаў і прадпрыемстваў горада і раёнаў, а ад сюль і рэзультаты дрэнныя. Работнікам паліўнага аддзела трэба часцей бываць на месцах торфаздабычы і штодзённа дапамагаць торфаздабываючым арганізацыям паляпшаць работу, а не быць ў ролі рэгістратараў вельмі дрэнна паступаючых і мала ўцяшальных зводак торфаздабычы.

Райкомы КП(б), райвыканкомы і первічныя партыйныя арганізацыі павінны ўзяць справу торфаздабычы пад свой штодзённы кантроль, рашуча ліквідаваць усе непарадкі і дапамагаць торфазагатоўчым арганізацыям. Тады план торфаздабычы безумоўна будзе выканан.

НА ТОРФАЗАВОДАХ ОБЛАСЦІ

Дзесятнікі

Па абочынах шасейнай дарогі, недалёка ад былога маёнтка памешчыка Бельскага раскінуліся багатыя залежы торфу. Масіў невялікі, але за тое торф тут добрай якасці, з нізкім процантам зольнасці.

Тысячагоддзямі балота захоўвала спакой. Толькі эрэдку ў засушлівае лета па ім прагульваліся тлустыя памешчыцкія каровы. Пан Бельскі ніколі і не задумваўся над тым, што ў яго пад бокам знаходзіцца такое багацце, як торф. Паліва для невялічкага спіртавога завода пан завозіў за сотні кілометраў. Завод работаў на каменным вугалі..

Былыя батракі памешчыка аказаліся больш здольнымі і лепшымі гаспадарамі за свайго папярэдніка. Кожны добра ведае, што вугаль дарагое паліва. Ён патрэбен краіне на больш важныя мэты. Ды і навошта вугаль, калі ў сябе дома ў некалькіх сот метрах ад завода залягаюць дзесяткі тысячы тон торфу, які па сваіх якасцях не горш вугалю.

...Вясной гэтага года пачалося наступленне на балоты — з мэтай здабываць у яго нетраў — чорнае золата, так неабходнае краіне. У маі месяцы з усходняга боку балотнага масіва торфаздабычу распачаў крухмальны завод „Вялікія Сіхновічы". А насупроць, па той бок шасейнай дарогі, торф здабывае спіртзавод „Ацечызна".

Абодва заводы за параўнальна кароткі час з поспехам выканалі даведзеныя планы здабычы торфу. Крухмальны завод „Вялікія Сіхновічы" за месяц работы перавыканаў свой план на 125 тон. Спіртзавод таксама выканаў сезонны план здабычы ў 2000 тон.

І як заўсёды і ўсюды нас цікавяць людзі, скромныя і аддаданыя працаўнікі, чыімі рукамі здабыты гэтыя поспехі. У першую чаргу хочацца расказаць аб брыгадзірах - дзесятніках, таленавітых арганізатарах, самавучках, здолеўшых па-большэвіцку арганізаваць зусім новую, раней не знаёмую для іх работу.

Вядома, былі цяжкасці і немалыя. Ні Казімір Фадзеевіч Шыдлоўскі — дзесятнік спіртзавода, ні Дзмітры Тыванчук нават не прадстаўлялі сабе правіл тэхнічнай эксплаатацыі тарфяных масіваў, тэхнікі здабычы. У працэсе работы прыходзілася вучыцца і вучыць людзей. Правільна гаворыць прыказка: „Вучопым ніхто не нараджаецца". Калі ў чалавека ёсць жаданне, ён заўсёды дасягне пастаўленай мэты. Жаданне работаць і вучыцца рабоце было і ёсць у Шыдлоўскага і Тыванчука. За кароткі час яны не толькі навучыліся здабываць торф, а навучылі гэтаму майстэрству дзесяткі людзей і, як відаць, надрэнна.

Сям'ю селяніна Церашука Міхаіла — можна па праву назваць майстрамі торфаздабычы. Гэтая выдатная сям'я тарфянікаў за змену здабывала 9000 цаглін торфу замест 4,5 тысячы штук па норме. Рэзчык Аляксей Ліпскі выразаў за дзень 11 тысяч цаглін, перавыконваючы норму ў сем раз. Добра работала брыгада Здарука Аляксея, якая кожны дзень давала звыш нормы 1,5 тоны торфу.

Стаханаўская работа тарфянікаў забяспечвала ім высокія заработкі. Так, напрыклад, кожны член брыгады Церашука зарабляў за дзень 15 рублёў.

Дзесятнік тав. Шыдлоўскі стварыў пастаянную брыгаду, якая працуе з самага пачатку сезона. Тыя-ж самыя людзі, якія капалі торф, наглядалі за яго сушкай і своечасовай штаблёўкай. Гэта павышае адказнасць за своечасовую ўборку, павышае якасць. Узоры стаханаўскай работы паказваюць тарфянікі Кавальчук Есіп і Разалін, браты Клюсік, Новік, Франц, Піліпук і іншыя.

Самым каштоўным у рабоце дзесятнікаў Шыдлоўскага і Тыванчука тое, што яны ўмеюць работаць з людзьмі, арганізаваць іх і направіць на выкананне пастаўленай задачы. Слова дзесятніка з'яўляецца для кожнага законам. Людзі не лічацца з часам, з цяжкасцямі, толькі-б выканаць план здабычы торфу.

Мы былі сведкамі таго, як дзесяткі маладых і пажылых мужчын і жанчын выйшлі на штабелёўку торфа нават у дзень рэлігійнага свята—Пятра і Паўла.

На торфабалоце „Ацечызна" кіпіць работа. Адны штаблююць, другія рэжуць торф, трэція варочаюць. І тут, у любы час, на кожным кроку можна сустрэць дзесятнікаў, якія наглядаюць за работай і вучаць людзей.

Таварышоў Шыдлоўскага і Тыванчука можна паставіць у прыклад многім дзесятнікам. Іх ёсць чаму павучыцца.

Я. Зарэцкі.

Торфабалота „Ацечызна".

На Усесаюзнай Сельскагаспадарчай Выстаўцы 1940 г.
На здымку: Павільён Беларускай ССР.

Фотахроніка ТАСС.

Дружна прыступілі да жніва

Каменец. На сенажацях калгаса імені Варашылава, Рэчыцкага сельсовета, кіпіць дружная стаханаўская работа. Скошаны ўжо апошнія гектары. Добра высушанае сена звозіцца ў пуні і складваецца ў стагі. З кожным днём усё больш і больш будынкаў запаўняецца добраякасным пахучым сенам, вырастаюць высокія стагі.

Калгас, пры плане ўборкі сенажаці 108 гектараў, убраў ужо 93 гектары. Сена з астатніх 15 гектараў будзе ўбрана па працягу аднаго—двух дзён. Калгаснікі Жук П., Жук Ф., Гук Д., Нерада І. і іншыя паказалі высокую прадукцыйнасць працы на касьбе. Яны выконвалі нормы выпрацовак на 120—130 процантаў. На ўборцы сена шырока арганізавана дапамога перадавікоў адстаючым звенням і калгаснікам.

На палях калгаса даспявае багаты ўраджай. Калгаснікі абагулілі свае азімыя пасевы і 11 ліпеня дружна прыступілі да жніва жыта выбарачным параджам. Агульны сход калгаснікаў да'лёва абмеркаваў план уборкі ўраджаю. За кожнай брыгадай і звяном замацаваны адпаведныя ўчасткі да канца ўборачнай.

Л. Нерода ў,
калгаснік калгаса імені Варашылава.

Працоўныя сяляне ўступаюць у калгас

Дружна і арганізавана ідзе праца ў нашым калгасе. У асноўным ужо закончана ўборка сенажацей. На касьбе і ўборцы сена асабліва добрыя паказчыкі далі калгаснікі першай брыгады Максімчук Яніна і комсамолка Манчук Анна. Яны кожны дзень перавыконвалі нормы выпрацоўкі. З энтузіязмам працавалі на ўборцы сена таксама калгаснікі другой брыгады комсамолка Антанюк Вера і Сарока Грыгорый.

Зараз уся ўвага калгаснікаў сканцэнтравана на тым, каб паспяхова правесці ўборку багатага ўраджаю. Калгаснікі склалі план уборачных работ. Зернавыя культуры на плошчы 150 га намечана ўбраць за 7 — 8 дзён. На жніве будуць працаваць дзве жнейкі. Жнеярамі вылучаны калгаснікі Саладуха Сцяпан і Максімчук Антон. За кожнай жнейкай па 8 жанчын будуць вязаць збожжа ў снапы.

На агульным сходзе калгаснікі рашылі пасевы азімых убіраць калектыўна. Ужо распачалося жніво жыта.

Бачачы перавагу калгаснай гаспадаркі над гаспадаркай аднаасобнай, працоўныя сяляне падаюць заявы аб прыёме іх у калгас. Нядаўна на агульным сходзе мы прынялі ў сваю дружную калектыўную сям'ю 5 аднаасобных гаспадарак вёскі Дымнечкі.

А. Крывушка, калгаснік калгаса ім. Чырвонай Арміі, Жабінкаўскага раёна.

Не паслабляць работу па падпісцы на пазыку

Хутка заканчваецца падпіска на Пазыку Трэцяй Пяцігодкі (выпуск трэцяга года) у Дамачэўскім раёне. На 12 ліпеня падпіскай па раёну ахоплена 3743 чалавекі па суму 352.024 рублі. Наяўнымі грашмі ўнесена 17.774 рублі. Рабочых і служачых ахоплена падпіскай 735 чалавек па суму 179.585 рублёў.

Актыўна праходзіць падпіска ў Мяднянскім сельскім совеце. 341 селянін пазычылі сваёй дзяржаве 25.575 рублёў. Наяўнымі ўнесена 1460 рублёў. У Чэрскім сельсавеце ахоплена падпіскай на пазыку 447 сялян на суму 23.395 рублёў, з якіх наяўнымі ўнесена 3326 рублёў. У Падлужскім сельсавеце 444 падпісчыкі далі ў пазыку дзяржаве 19.865 рублёў і ўнеслі наяўнымі 4210 рублёў.

Слаба ідзе падпіска ў Прыбараўскім сельскім совеце. Усяго сума падпіскі дасягае 7235 рублёў, з якіх наяўнымі ўнесена 2053 рублі. Адстае Камароўскі сельсавет. У ім падпіскай ахоплена толькі 282 селяніны на суму 7710 рублёў і сабрана наяўнымі ўсяго 282 рублі.

Малы ахват насельніцтва падпіскай і слабае паступленне наяўных грошай у лік падпіскі на пазыку ёсць рэзультат нездавальняючай масава-растлумачальнай работы ў гэтым сельсавеце.

М. Ф.

7738 РУБЛЁЎ САБРАНА НАЯЎНЫМІ

У Казловіцкім сельскім совеце налічваецца 550 гаспадарак. 856 працаздольных сялян гэтых гаспадарак ахоплены падпіскай на пазыку на суму 17500 рублёў. Наяўнымі ўжо ўнесена 7738 рублёў.

Шырока разгорнута сярод насельніцтва масава - растлумачальная работа, якую праводзяць упаўнаважаныя па падпісцы. У вёсцы Сухарэвічы-Вялікія ўпаўнаважаны таварыш Дубейкін Пётр з сумы падпіскі 1610 рублёў сабраў наяўнымі 1446 рублёў.

Другі ўпаўнаважаны таварыш Гаўрылюк Грыгорый ахапіў падпіскай па пазыку ўсіх жыхароў свайго ўчастка. 59 чалавек падпісалася на суму 1005 рублёў, з якіх наяўнымі унеслі 430 рублёў.

Падпіска на пазыку па сельскаму совету закончана поўнасцю. Сяляне працягваюць уносіць наяўныя грошы ў лік сваёй падпіскі на пазыку.

Фегельман.

ПАДРЫХТАВАНА СУСТРЭНЕМ ДЗЕНЬ ПРЫЗЫВА

Днямі адбыўся сход прызыўнікаў гарадскога пасёлка Каменец. На сходзе прысутнічала больш 120 чалавек.

Удзельнікі схода з вялікай цікавасцю заслухалі даклад „Аб усеагульным воінскім абавязку".

На сходзе дапрызыўнікі абавязаліся дзень прызыва ў рады Рабоча - Сялянскай Чырвонай Арміі сустрэць падрыхтаванымі, а імена: ліквідаваць непісьменнасць сярод прызыўнікаў, актыўна ўдзельнічаючы ў абаронных гуртках, кожнаму прызыўніку вывучыць адну з воінскіх спецыяльнасцей.

М. Д. Шапавалаў.

Ажыццяўленне ваеннай праграмы ЗША

НЬЮ-ЙОРК, 12 ліпеня (ТАСС). Па паведамленню агенцтва Юнайтэд Прэс, амерыканскі кангрэс канчаткова адобрыў законапраект аб расшырэнні ваенна - марскога флота ЗША на 75 процантаў. Урадавы эксперт авіяцыі Мід заявіў, што з 1 ліпеня ўрад размясціў заказы на выраб самалётаў і авіяцыйнага абсталявання на сто мільёнаў даляраў. Далей Мід заявіў, што ў выніку ажыццяўлення праграмы ўзбраення амерыканская армія будзе мець праз два гады 25 тысяч самалётаў і марская авіяцыя — 10 тысяч.

Насустрач Другому Усесаюзнаму Дню Фізкультурніка

Спаборніцтвы па лёгкай атлётыцы

У мястэчку Белавежа, Гайнаўскага раёна, днямі адбыліся раённыя спаборніцтвы на першынства па лёгкай атлётыцы: валейболу, баскетболу, веласіпедным яздзе і плаванню, арганізаваныя камітэтам фізкультуры і спорта.

Спаборніцтвы праводзіліся з мэтай папулярызацыі гэтых відаў спорта і выяўлення мацнейшых каманд і лепшых валейбалістаў, баскетбалістаў, плаўцоў.

У спаборніцтвах прымалі ўдзел 89 лепшых фізкультурнікаў раёна, ад фізкультурных калектываў: Белавежы, чыгункі, лесазавода, ад школы фабрычнаазводскага вучнёўства, сярэдняй школы і другіх.

Найбольшую колькасць ачкоў набрала каманда фізкультурнага калектыва гайнаўскага камбіната і заняла першае месца, другое месца заняла каманда Белавежы, трэцяе — лесазавода, чацвертае каманда чыгункі, пятае каманда Нарэўкі.

Спаборніцтва праводзіліся па нарматывах комплекса „Гатоў да працы і абароны". Усе ўдзельнікі спаборніцтваў здалі нормы на значок „Гатоў да працы і абароны" па відах спорта, у якіх кожны прымаў удзел у спаборніцтвах.

Першае месца заняў па веласіпрабегу на дыстанцыю 20 кілометраў лепшы гоншчык вобласці тав. Шпаковіч—34 мін. 18 секунд. Другім прыйшоў тав. Маеўскі — 34 мін. 52 секунды. Трэцім прыйшоў малады велагоншчык тав. Купрыянюк—35 мін. 53 секунды.

Па прабегу першыя месцы занялі: на дыстанцыю 100 метраў тав. Рубін (камбінат), на 800 метраў тав. Взерскі (лесазавод), на 1500 метраў тав. Панасюк (школа ФЗУ).

Прыжок у даўжыню з разбегу —тав. Ількоўскі (сярэдняя школа) —5 метраў 38 см., прыжок у вышыню з разбегу тав. Абуховіч (лесазавод)—1 метр 53 см., мятанне дыска тав. Антаюк (камбінат)—31 метр 20 см., мятанне гранаты тав. Лесяк (камбінат)—50 метраў 50 см., ён-жа і па мятанню ядра—9 метраў 90 см. Паспяхова прайшлі спаборніцтвы па баскетболу і валейболу.

Трыццаць лепшых спартсменаў і спартсменак раёна, члены зборнай каманды на абласныя спаборніцтвы, прыступаюць да сістэматычнай трэніроўкі, каб дастойна адзначыць свята фізкультурнікаў.

Дацкевіч,
старшыня райкамітэта фізкультуры і спорта.

ПАВЕДАМЛЕННЕ.

15 ліпеня 1940 года, у 8 гадзін вечара, у памяшканні гарадскога тэатра адбудзецца сустрэча партыйнага, комсамольскага, совецкага, і профсаюзнага актыва з пісьменнікам-ордэнаносцам **А. С. Новікавым-Прыбоем.**

Уваход па білетах. Білеты выдаюцца ў гаркоме КП(б)Б.

ГАРКОМ КП(б)Б.

Комуністычнае выхаванне працоўных — цэнтральная задача

(На абласной нарадзе па агітацыі)

Справа комуністычнага выхавання працоўных, перамагання перажыткаў капіталізма ў сазнанні людзей набывае ўсё большае значэнне для паспяховага разгортвання соцыялістычнага будаўніцтва ў заходніх абласцях. Жыццё з кожным днём ставіць перад партыйнымі арганізацыямі, перад агітатарамі ўсё новыя і новыя задачы.

У метах падагульнення лепшага вопыту мас, выяўлення запатрабаванняў мас і намячэння шляхоў для лепшага ідэйнага і арганізацыйнага кіраўніцтва агітацыйнай работай, аддзел прапаганды і агітацыі абкома партыі правёў у горадзе і ў раёнах нарады агітатараў. 10 ліпеня адбылася абласная нарада, на якой прысутнічалі з 14 раёнаў обласці 33 агітатары і кіраўнікі агіткалектываў.

Нарада паказала, што ў той велізарнай палітычнай рабоце, якую праводзяць у масах партыйныя арганізацыі і, пад іх кіраўніцтвам, тысячы агітатараў з мясцовага актыва, ёсць рад істотных недахопаў.

Таварышы ўказвалі, што зацікаўленасць мас да жывога большавіцкага слова не толькі не аслабла, але яшчэ павысілася. Але складанасць міжнароднай абстаноўкі, задачы соцыялістычнага будаўніцтва прад'яўляюць усё больш высокія патрабаванні да агітацыі і агітатараў. Насельніцтва патрабуе кваліфікаваных дакладаў, канкрэтных адказаў на хвалюючыя пытанні. Між тым, па адзінадушнай думцы выступаўшых таварышоў, палітычны і культурны ўзровень масы агітатараў яшчэ надзвычайна нізкі. Тое-ж, што робяць партарганізацыі на месцах для ідэйнага ўзбраення агітатараў, з'яўляецца зусім недастатковым.

Тав. **Хрэнаў**—кіраўнік агіткалектыва Лыскаўскага сельсовета, Ружанскага раёна, расказаў, што кожны раз агітатары звяртаюцца да яго з усё большай колькасцю пытанняў, на якія агітатары не змаглі адказаць сялянам. Тав. Хрэнаў пабываў на занятках у 8 агітатараў і канстатуе, што многія з іх тушуюцца, калі ім задаюць больш вострае пытанне, што ў іх адказах няма большавіцкай праматы і яснасці. Прамоўца прапануе арганізаваць больш сур'ёзную вучобу агітатараў, шляхам правядзення раённых курсаў—семінараў, павышэння якасці работы агіткалектываў. Ён таксама ўказвае, што агітатар не мае магчымасці набыць літаратуру—палітычную, сельскагаспадарчую, мастацкую,—бо яе няма не толькі на вёсцы, але і ў магазінах раённага цэнтра.

Агітатар з Кобрына тав. **Кравец** указвае, што райком партыі вельмі мала дапамагае агітатарам горада ў іх росце, і таму многія агітатары, якія працавалі ў час выбараў у Вярхоўныя Саветы СССР і БССР, спынілі работу ў масах. Яна заяўляе, што агітатары жадаюць вывучаць „Кароткі курс гісторыі ВКП(б)" і патрабуюць у гэтым адпаведнай дапамогі.

Аб адсутнасці дыферэнцыраванага падыходу да асобных груп насельніцтва і, у прыватнасці, аб неэдавальняючай рабоце сярод жанчын гаварыў тав. **Дзякаў** з Бярозаўскага раёна. Ён прыводзіць такі факт: у адной з вёсак жанчыны прад'явілі яму, як кіраўніку агіткалектыва, патрабаванне правесці сход жанчын з дакладам аб правах жанчыны па Канстытуцыі СССР. На гэтым сходзе сялянкі заявілі: „Совецкі закон вельмі правільны і добры. Але вось у нас яго не выконваюць". Яны прывялі абурэючыя факты пра селяніна, які здзекуецца над сваёй жонкай. Зараз справа аб гэтым селяніне перадана судовым органам. Ён прапануе практыкаваць раз у месяц склікание сходаў жанчын.

Рад таварышоў на канкрэтных фактах падкрэслівалі неабходнасць больш улічваць нацыянальныя моманты ў агітацыйнай рабоце і ўзмацніць інтэрнацыянальнае выхаванне мас. Тав. **Курэша** (Кобрын) на мясцовых прыкладах паказаў, што сярод часткі насельніцтва яшчэ не зжыты пагардлівыя адносіны да працы.

Цікавым вопытам работы падзяліўся тав. **Ціхаміраў** — кіраўнік агіткалектыва з Дывінскага раёна.

— Наш агіткалектыў з 16 чалавек абслугоўвае тры населеныя пункты, — гаворыць тав. Ціхаміраў. Заняткі калектыва праводжу рэгулярна два разы ў месяц. Дасканала вывучыў з агітатарамі даклад таварыша Панамарэнка на XVIII з'ездзе КП(б)Б, рашэнні партыі і ўрада аб пастаўках, законы аб грашовых плацяжах, рэгулярна інфармую агітатараў аб апошніх падзеях. Апошнія заняткі былі прысвечаны 20-годдзю вызвалення БССР ад белапалякаў. З поспехам выкарыстаў матэрыялы з журналаў „Спутник агитатора" і „Партийное строительство". У прывезенасці артыкул аб эканоміцы калгаса вельмі зацікавіў сялян. Я рэкамендаваў сваім агітатарам выкарыстаць для агітацыйнай работы ўсе магчымасці і месцы, дзе збіраюцца групы сялян: на прызбах, ля кааператыва. І гэта дае добрыя вынікі. Мы вывучылі з моладдзю закон аб усеагульным ваенным абавязку. Добра прайшла па сельсовету падпіска на пазыку.

Тав. **Андруковіч Марыя** — агітатар калгаса імені Варашылава, Жабінкаўскага раёна і **Клімец** — кіраўнік агіткалектыва з Шэрашэўскага раёна расказалі аб вопыце агітацыйнай работы ў калгасах. Асноўная форма работы летам — гэта чыткі і гутаркі ў брыгадах у полі, у час абедзенных перапынкаў. У калгасе імені Варашылава з поспехам выступаюць перад сялянамі драматычны і харавы гурткі. Таварышы адзначаюць выключную ролю калгасных насценных газет у выхаванні мас калгаснікаў.

Тав. **Шостак** з Дамачэўскага раёна ўпімае сур'ёзнае пытанне: у нашай палітычнай рабоце на вёсцы часта ўпускаем работу з беднатой. Яна таксама ставіць пытанне аб тым, што не створаны ўмовы для культурнай работы на вёсцы.

Удзельнікі нарад падвяргалі жорсткай крытыцы работу абласнога кінотэатра, які недапушчальна дрэнна арганізаваў абслугоўванне вёскі кінофільмамі.

Тав. **Кацнельсон** (Каменец) падрабязна спыняецца на значэнні друкаванай агітацыі і крытыкуе абласную газету, якая вельмі мала дапамагае агітатарам, як кансультацыямі, так і асабліва перадачай дадатнага вопыту лепшых агітатараў. Ён завастрае ўвагу на яўна нездавальняючую работу палітасветных устаноў на вёсцы і дрэнным кіраўніцтве іх з боку абласнога аддзела народнай асветы. Ён прапануе забяспечыць усе хаты-чытальні радыёўстаноўкамі.

Істотным недахопам у рабоце нарады з'яўляецца тое, што вельмі мала было ўдзелена ўвагі пытанню аб рабоце на прадпрыемствах, у прыватнасці, рабоце па растлумачэнню Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб пераходзе на васьмігадзінны рабочы дзень і сямідзённы рабочы тыдзень.

Аддзелам прапаганды і агітацыі партыйных камітэтаў і пярвічным партыйным арганізацыям неабходна ўлічыць прапановы і пытанні, узнятыя на нарадах агітатараў і намеціць рад канкрэтных мерапрыемстваў па павышэнню якасці агітацыйнай работы і палепшанню ідэйнага і арганізацыйнага кіраўніцтва агітатарамі.

А. Рабінавіч.

У піонерскім лагеры

У некалькі кроках ад шашы стаіць двухпавярховы прасторны і свежы новы каменны будынак. З левага боку ад яго ўзвышаецца высокі шост, на версе якога горда развяваецца чырвоны сцяг. Управа ад будынка, каля сасновага бору, распаложаны дашчаты барак і сталовая. Крыху далей па ўсход срэбрыстая, поўнаводная рака. Сярод багатай прыроды знаходзіцца новы, толькі што адкрыты піонерскі лагер горада Брэста. Сто пяцьдзесят юнакоў, дзяцей працоўных прыехала сюды каб адпачыць, загарэць, набрацца сіл і энергіі для вучобы ў новым навучальным годзе.

Юныя лагернікі ўвесь дзень выкарыстоўваюць на свежым паветры: купаюцца, ловяць рыбу, граюць у футбол, наладжваюць ваенныя ігры, развучваюць новыя песні, вершы. Дзеці падружыліся з лагерам, палюбілі яго.

Кожны дзень тут насычан канкрэтнай справай. Важатая таварыш Васільева ў сваім атрадзе правяла гутарку: „Будзем як Ленін". У сваім плане яна прадугледзела пазнаёміць рэбят з легендарнымі героямі грамадзянскай вайны, з героямі—піонерамі. Гэта дапаможа выхоўваць у дзяцей пачуццё новага, любоў да працы—Соцыялістычнай радзімы. Такая работа праводзіцца і ў атрадзе № 4.

Пры дапамозе ваенных і фізкультурных іграў прывіваецца юным лагернікам смеласць, лоўкасць, знаходлівасць. Трэба сказаць, што гэтыя ігры вельмі спадабаліся рэбятам.

Аднак у лагеры не арганізавана перадача вопыту работы аднаго важатага другому. Старшая важатая тав. Нехаміна рэдка іх склікае, а яшчэ радзей знаёміцца з іх планамі. У сваё апраўданне яна заяўляе: „ Нічога не магу зрабіць, не слухаюць важатыя..." На самай справе прычына не ў гэтым, а ў тым, што няма патрабавальнасці і арганізуючай ролі старшага важатага.

Для таго, каб задаволіць патрабаванні рэбят, недастае яшчэ многага. У лагеры няма бібліятэкі, патэфона, радыё. Усё гэта магчыма было мець, калі-б лагерная камісія на чале са старшынёй таварышом Салаўём загадзя прадумала, што неабходна для культурнага адпачынку дзяцей у лагеры. Рэбяты скардзяцца, што газеты, выпісаныя для лагера, ідуць з перабоямі. Прачытаць-жа газету, пазнаёміцца з навінамі з міжнароднага і ўнутранага жыцця, вельмі патрэбная і неабходная справа.

У адным з пакояў стаяць дзве гармоні. Ніхто не паклапаціўся каб іх выкарыстаць для адпачынку рэбят.

— Няма зацейнікаў—гарманістаў, — апраўдваецца начальнік лагера таварыш Радкевіч. Апраўданне гэта ні к чаму. У горадзе Брэсце ёсць многа таленавітых маладых гарманістаў. З іх можна было падабраць аднаго—двух для лагера. Справа ўся ў тым, што гэта простае і ўнаўне вырашымае пытанне загадзя не прадугледжана.

Прывіваць любоў да працы

Лагер павінен развіваць у рэбят самадзейнасць, прывіваць любоў да працы. І гэта ясна. Наша краіна не вырашчвае беларучак, а вырашчвае выдатныя кадры будаўнікоў новага соцыялістычнага жыцця. Гэтыя якасці, якасці новага чалавека, у рэбят неабходна выхоўваць з буднічных „дробязей", а для гэтага вялікае поле дзейнасці. У лагеры не поўнасцю лічацца з гэтай акалічнасцю. Рэбяты не мабілізаваны для барацьбы за чыстату і апратнасць у лагеры. У пакоях антысанітарыя. Падлога рэдка мыецца і падмятаецца. Навакол інтэрната накідана трэсак, паперы. Каля сталовай выліваюць астачу ежы. Гэтага-б не было, калі-б кожны лагернік ведаў, што барацьба за чыстату—яго кроўная справа. Парадак і чыстату ў лагеры павінны наводзіць самі рэбяты разам з важатым і ўрачом.

Бяспечнасць

Лагер распаложан каля самой дарогі. У яго лёгка папасці патрэбнаму і непатрэбнаму чалавеку. Ноччу апрача сталовай нішто другое не ахоўваецца вартавымі. Днём у лагер можна папасці без усякай цяжкасці. Ні дзяжурны, ні важатыя, ні нават сам начальнік лагера тав. Радкевіч ніколі ні ў каго не запытваюць дакументаў. Дастаткова толькі назваць прозвішча і па якой справе прышоў, як гэтага чалавека бесперашкодна прымаюць з распрасцёртымі рукамі. Днямі быў такі выпадак. У лагер прыйшла незнаёмая жанчына:

— Хто галоўны?—звярнулася яна да групы людзей.

— Я,—адказаў начальнік лагера.—Вам што патрэбна?

— Я повар і жадаю да вас паступіць на работу, — адказала жанчына.

— Можна, можна, ідзіце на кухню і знаёмцеся з работай, — паследваў адказ.

Хто яна, адкуль, гэта зусім не цікавіла начальніка лагера.

Даверчывасць, вера на слова—лепшыя сябры бяспечнасці. Трэба гэта зразумець раз і назаўсёды.

Дзе-ж лагерная камісія

Месяц назад, як адкрыт лагер. За прайшоўшы час ніхто з членаў лагернай камісіі не пацікавіўся, як жывуць і адпачываюць юныя лагернікі. Толькі нядаўна лагер „наведаў" старшыня лагернай камісіі тав. Салавей. Гэта пасля таго, як яму стала вядома, што аб рабоце лагера ставіцца пытанне на бюро гаркома партыі. Да чаго „аператыўны" чалавек?! Справы ў лагеры, як нам вядома, і пасля гэтага нічуць не лепшымі сталі. Па-ранейшаму ў непагоду працякае дашчаты дах сталовай і барака, замачваючы рэбят. Праўда, у свой час тав. Салавей абяцаў дапамагчы пакрыць дах толлю, але ўсё гэта засталося толькі абяцаннем. У лагеры адзін урач і зусім няма медыцынскіх сясцёр. Маючыйся ўрач абслугоўвае акрамя лагера дзіцячы дом. Бывае так, што лагер застаецца без урачэбнага нагляду на працягу двух — трох дзён. Такое становішча, як бачна, не турбуе ні гарадскі аддзел аховы народнага здароўя, ні лагерную камісію. Урач лагера тав. Шэйд да абавязкаў сваіх адносіцца несумленна. Не сочыць за тым, каб у лагеры было чыста і добра арганізавана харчаванне. Ёсць факты нячулых адносін да дзяцей.

У лагеры па поваду старшыні лагернай камісіі таварыша Салаўя гавораць: „Таварыш Салавей нам многае абяцае, а як паедзеш да яго, адмаўляецца дапамагчы". Так атрымалася 8 ліпеня. У горадзе для лагера былі закуплены прадукты. Трэба было іх даставіць. Начальнік лагера таварыш Радкевіч знайшоў машыну без бензіну. Дзе-ж дастаць бензін? Рашыў пазваніць таварышу Салаўю і далажыць аб здарыўшымся. Так і зрабіў. Ад тав. Салаўя паследваў адказ: „Бензіну няма, шукайце самі". Пасля настойлівай просьбы справа была даручана сакратару горвыканкома. Праходзіла гадзіна, другая, а бензіну па-ранейшаму не было. Прадукты ў лагер былі дастаўлены толькі з дапамогай абкома партыі.

Каму патрэбна такая дапамога лагернай камісіі?

Г. Паўлаў.

Брытанская ваенна-марская база ў Сяродземным моры

Ваенны порт на востраве Мальта Фотокліше ТАС

Камунікэ англійскага міністэрства авіяцыі

ЛОНДАН, 12 ліпеня (ТАСС). Афіцыяльна паведамляецца, што ўчора вечарам непрыяцельская авіяцыя бамбардыравала гарады паўднёвага ўзбярэжжа Англіі. Маюцца афіары, разбураны збудаванні. Збіт 21 германскі самалёт і адзін гідрасамалёт. Многа іншых сур'ёзна пашкоджана. Англійская авіяцыя страціла 4 самалёты.

Непрыяцельскія самалёты зноў бамбардыравалі адзін з гарадоў паўднёва-ўсходняга ўзбярэжжа. Ёсць афіары сярод насельніцтва. Два дамы разбураны і два пашкоджаны. Бомбы скінуты на поперашай дапамогі. Знаходзячыя там людзі загінулі. Пры другім налёце па паўднёва-ўсходняе ўзбярэжжа пашкоджаны дзве гасцініцы, некалькі буйных збудаванняў, а таксама будынкі банка і паліцыі.

Англійская авіяцыя бамбардыравала ваенныя аб'екты Францыі, Бельгіі і Галандыі. Адзін англійскі самалёт загінуў без вестак. На аэрадроме ў Булоні (Францыя) знішчана 5 самалётаў працяўніка.

Страты гандлёвага флота

БЕРЛІН, 12 ліпеня (ТАСС). Бюлетэнь „Дынст аус Дэйчланд", абвяргаючы англійскае паведамленне аб колькасці патопленых суднаў, прыводзіць даныя вярхоўнага камандвання германскай армії. За апошнія 6 тыдняў ваенных дзеянняў, піша бюлетэнь, германскімі падводнымі лодкамі патоплена суднаў агульным дазмяшчэннем звыш 600 тысяч т.

Спачатку вайны мінамі і т. педамі патоплена суднаў змяшчэннем у 1 мільён 920 ты. тон і надводнымі караблямі г. манскага флота 1 мільён тысячы тон.

Эвакуацыя з Александры

ЛОНДАН, 12 ліпеня (ТАСС). Па паведамленню агенцтва Рэйтэр, з мінулага тыдня непрыяцельская авіяцыя вытварае днём і ноччу разведвальныя палёты над Александрыяй. Ужо каля 80 тысяч чалавек эвакуіравана з горада. Чыгуначныя станцыі перапоўнены пасажырамі.

Англійскія заказы ў Амерыцы

ЛОНДАН, 12 ліпеня (ТАСС). Па паведамленню агенцтва Рэйтэр, міністр авіяцыйнай прамысловасці Бівербрук заявіў у палаце лордаў, што Англія „штодзённа траціць дзесяць мільёнаў даляраў на самалёты. Амерыканцы дакладна выконваюць нашы заказы і ўсё абяцанае адправілі нам ва многіх выпадках нават датэрмінова. Зараз мы не адчуваем недахопу ў самалётах".

Дэмабілізацыя французскай армії

БЕРЛІН, 12 ліпеня (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро паведамляе, што французскі ваенны міністр апублікаваў распараджэнне аб ускоранай дэмабілізацыі армії. Сяляне і рабочыя ад 37 год і старэй будуць дэмабілізаваны, калі распалагаюць сродкамі для звароту да месца жыхарства ў неакупіраваныя раёны.

Выступленне Петэна

ЛОНДАН, 12 ліпеня (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр паведамляе: „Выступаючы ўчора па радыё, Петэн заявіў, што французскі ўрад будзе прасіць Германію аб дазволе на пераезд урада ў Версаль і міністэрстваў у Парыж. Петэн паведаміў аб стварэнні новага ўрада з 12 міністраў і назначэнні 12 губернатараў правінцый".

Становішча ў Парыжы

НЬЮ-ЙОРК, 12 ліпеня (ТАСС). Агенцтва Юнайтэд Прэс паведамляе: „Парыжскія газеты вітаюць новую французскую канстытуцыю" Газета „Матэн" у перадавым артыкуле пад загалоўкам „Канец англійскага рэжыма ва Францыі" васхваляе Петэна. У Парыжы арганізавана часовая камісія „Садзейнічання эканамічнаму аднаўленню краіны", якая складаецца з сенатараў і дэпутатаў, астаўшыхся ў Парыжы пасля бегства ўрада.

Пазіцыя Іспаніі

СТАКГОЛЬМ, 12 ліпеня (ТАСС). Па паведамленню з Будапешта, у інфармаваных дыпламатычных кругах заяўляюць, што Іспанія ў бліжэйшыя дні ўступіць у вайну на баку Італіі і Германіі.

Японцы абстралялі два англійскіх параходы

ЧУНЦІН, 12 ліпеня (ТАСС). З Фучжоу паведамляюць, што японцы абстралялі два англійскіх параходы, ішоўшыя з грузам з Шанхая ў правінцыю Фуцзянь. Параходы сур'ёзна пашкоджаны. Забіта 6 чалавек, ранен адзін.

Хроніка

Соўнарком Саюза ССР увёў тав. Канстанцінава А. Т. у склад камітэта па справах мастацтваў пры Соўнаркоме Саюза ССР і назначыў яго намеснікам старшыні камітэта (па адміністратыўных і гаспадарчых пытаннях).

У сувязі з гэтым Соўнаркам Саюза ССР вызваліў тав. Канстанцінава А. Т. ад абавязкаў члена калегіі Народнага Камісарыята прамысловасці будаўнічых матэрыялаў СССР.

(ТАСС)

Адказны рэдактар Г. Т. МІНЧУКОЎ

Парушэнне прынцыпаў совецкага гандлю

Дрэнна адносіцца да сваіх абавязкаў крамнік сельскага спажывецкага таварыства ў вёсцы Вялікае Сяло, Шэрашэўскага раёна, К. Піцюк. Ён парушае правілы совецкага гандлю. Усе прыбываючыя тавары і асабліва мануфактуру, Піцюк раней бярэ сабе і прадае знаёмым, а рэшткі — спажыўцам. Такія паводзіны Піцюка выклікаюць справядлівае абурэнне пайшчыкаў.

Безумоўна, што праўленне сельскага спажывецкага таварыства ведае аб гэтым, але не прымае ніякіх мер.

Марудна ідзе тут работа і з загатоўкай сельскагаспадарчых прадуктаў. Сяляне з вялікай ахвотай прадаюць свае лішкі прадуктаў дзяржаве, але з-за таго, што загатоўчыя органы дрэнна работаюць, часта прадукты трапляюць у рукі спекулянтаў.

М. Бармута, калгаснік калгаса 1-го Мая, Шэрашэўскага раёна.

БРЭСЦКАЕ ПЕДВУЧЫЛІШЧА
аб'яўляе набор навучаючыхся на I і II курс

ТЭРМІН НАВУЧАННЯ 3 ГАДЫ

На першы курс прымаюцца асобы, маючыя асвету не ніжэй сямі класаў сярэдняй школы (10-годкі)

На другі курс з асветай не ніжэй васьмі класаў сярэдняй школы, або чатырох класаў былой польскай гімназіі, ва ўзросце ад 15 да 35 гадоў.

Студэнты забяспечваюцца стыпендыяй на агульнай асновах, а іншагароднія і інтэрнатам.

Заявы падаваць на імя дырэктара з прыкладаннем наступных дакументаў: 1. Метрычная даведка. 2. Паведчанне аб асвеце. 3. Аўтабіяграфія. 4. Тры фотакартачкі. 5. Даведка ад урача аб здароўі.

Прыём заяў праводзіцца да 20 жніўня.

Прыёмныя іспыты з 20-га па 25 га жніўня па наступных прадметах: па беларускай і рускай мовах (вусна і пісьмова), арыфметыка (вусна і пісьмова), алгебра (вусна), геометрыя (вусна), геаграфія (вусна,) і Канстытуцыя СССР.

Адрас педвучылішча: горад Брэст, вул. Карла Маркса № 80.

Дырэкцыя.

Брэсцкая цэнтральная ашчадкаса просіць усіх бухгалтараў прадпрыемстваў, устаноў і домакіраўніцтваў горада Брэста **не пазней 20 ліпеня 1940 года** з'явіцца для афармлення сваіх рахункаў **па пазыцы.**

Адрас: **Маскоўская 20, Цэнтральная ашчадкаса.**

Брэсцкая абласная вагарамонтная майстэрня даводзіць да ведама ўсіх устаноў і арганізацый, а таксама гандлёвых арганізацый, што з 9 ліпеня г. г. вытвараецца рамонт і ўстаноўка вагаў розных сістэм і гір.

Адрас: Брэст, Будзённага 64а.

СЁННЯ Ў КІНОТЭАТРАХ

Кінотэатр „1-га МАЯ"
„ВОЛЬШОЙ ВАЛЬС"

Кінотэатр імені ГОРКАГА
„ВЕСЕЛЫЕ РЕБЯТА"

ГАСТРОЛІ ГОМЕЛЬСКАГА АБЛАСНОГА РУСКАГА ДРАМАТЫЧНАГА ТЭАТРА

14 ліпеня К. Крапіва

КТО СМЕЕТСЯ ПОСЛЕДНИМ

камедыя ў 3 дзеях. Пачатак у 9 гадзін

Каса адкрыта з 12 г. да 3 гадзін дня, з 6 г. да 9 гадзін вечара.

Адкрыта гарадская каса на вуліцы Пушкінскай, вугал Комсамольскай, кіёск „Саюзпечаць".

Адрас рэдакцыі: г. Брэст, вуліца імені Карла Маркса 29. Тэлефоны 1—17, 1—23. Друкарня ім. Варашылава Аб'ём 167